# Ад рэдактара

З вялікім задавальненнем і гонарам прадстаўляем увазе шаноўнага чытача юбілейны дзясяты нумар *Гадавіка Цэнтра Беларускіх Студый*[1]. Сёння можна сцвярджаць, што *Гадавік* мае вядомасць і пазнавальнасць сярод перыядычных навуковых выданняў па гісторыі народаў былой Рэчы Паспалітай, асабліва рэгіёна Украіна – Літва – Беларусь (УЛБ). Разам з юбілеем *Гадавіка* адбыліся змены ў складзе яго рэдакцыі. На працягу існавання часопіса я выконвала абавязкі сакратара рэдакцыі. Назапашаны вопыт працы і давер калег дазволілі мне ўзначаліць рэдакцыю. Для мяне вялікі гонар працягваць працу маіх папярэднікаў Генадзя Семенчука і Аляксандра Смаленчука.

За гады існавання *Гадавіка* выкрышталізавалася яго канцэпцыя, агучаная ў сёмым нумары. Да тэматычных прыярытэтаў *Гадавіка* належыць праблематыка мінулага народаў былой Рэчы Паспалітай (рэгіёна УЛБ) у суадносінах з гісторыяй Польшчы і Расіі. Таксама ўсталявалася структура часопіса, якая традыцыйна складаецца з дыскусіі на актуальныя тэмы з гісторыі УЛБ, навуковых артыкулаў, размоў з вядомымі даследчыкамі, рэцэнзій і хронікі навуковага жыцця.

Юбілейны нумар Гадавіка рыхтаваўся сумесна з Аляксандрам Смаленчуком. Гэты нумар прысвечаны 160-м угодкам паўстання 1863–1864 гг. На старонках часопіса прадстаўлены артыкулы і рэфераты аўтараў з Беларусі, Польшчы, Літвы і Украіны. Даследчыкі ўздымаюць пытанне значэння паўстання для беларускага, літоўскага, польскага і ўкраінскага грамадства (Дарыюс Сталюнас); аналізуюць вобраз Кастуся Каліноўскага ў памяці беларусаў (Іван Курловіч) і характарызуюць трактоўку паўстання ў беларускай гістарыяграфіі (Дзмітрый Матвейчык). Аляксандр Радзюк праанналізаваў следчыя справы паўстанцаў як крыніцу па гісторыі паўстання. Прадметам даследавання Іны Соркінай стала роля яўрэяў у паўстанні. Веслаў Цабан засяродзіўся на стаўленні сібірскіх ссыльных да падзей Студзеньскага паўстання. Генадзь Семянчук і Алесь Жлутка працягнулі даследаванне радаводу Кастуся Каліноўскага і падрыхтавалі да друку „Вывадовую справу" бацькі Кастуся Сямёна Каліноўскага.

У рубрыцы *Дыскусія* навукоўцы з Беларусі і Літвы выказаліся наконт гэтак званай тэорыі літвінізму, якая нечакана набыла актуальнасць. Большасць гісторыкаў звярнулі ўвагу на штучнасць і пэўную палітычную

[1] Studium Europy Wschodniej [online], https://studium.uw.edu.pl [дата доступу: 06.05.2024]

правакацыйнасць прадстаўлення „літвінізму" ў літоўскіх СМІ і выказалі прапановы па вырашэнні спрэчных пытанняў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Таксама варта звярнуць увагу на артыкулы Дарыюса Сталюнаса пра спробы ўвядзення польскай мовы ў пачатковых школах Гродзенскай губерні ў пачатку XX ст. і Пятра Ціхарацкага пра ўплыў вайны ў Іспаніі на дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў 1936–1939 гг.

Трэба прызнаць, што рэгіён УЛБ развіваецца пад уплывам вайны ва Украіне. Пэўным водгукам на гэты ваенны канфлікт з'яўляецца артыкул Алены Кандрацюк пра ўкраінскі погляд на перспектывы ўкраінска-беларускіх адносін. Гэты тэкст падрыхтаваны на падставе вуснай гісторыі.

У раздзеле *Дыялогі* прадстаўлена размова А. Смаленчука з прафесарам Ганнай Энгелькінг пра яе шлях у навуку і матывы навуковай цікавасці да беларускай праблематыкі. Таксама ў *Гадавіку* публікуюцца рэцэнзіі на наступныя выданні:

- *История белорусских земель и белорусского государства. Краткий очерк. Материалы к лекционному курсу. Учебное пособие для вузов*, под ред. В. В. Даниловича, О. В. Солоповой, Санкт-Петербург 2023, 102 с. (Труды исторического факультета МГУ. Вып. 237. Сер. III: Instrumenta studiorum, 51) (А. Калядка)
- С. Токць, А. Вашкевіч, *Холад, голад і зараза. Кліматычныя анамаліі, эпідэміі і соцыум у Беларусі ў 40–50-я гады XIX ст. (на матэрыялах Гродзенскай губерні)*, Гродна 2023, 258 с. (С. Грунтоў);
- J. Gierowska-Kałłaur, *Józef Piłsudski wobec kwestii białoruskiej (1918–1920)*, Warszawa 2023. 496 s. (А. Чарнякевіч);
- S. Łotysz, *Pińskie błota. Natura, wiedza i polityka na polskim Polesiu do 1945 roku*, Kraków 2022, 565 s. (А. Смалянчук).

На заканчэнне віншуем усіх калег, якія прычыніліся да выданняў *Гадавіка*, з дзесяцігадовым юбілеем. Выказваем удзячнасць кіраўніцтву і калектыву Студыюм Еўропы Усходняй за падтрымку і дапамогу ў выданні часопіса. За час існавання *Гадавіка* сфарміраваўся згуртаваны рэдакцыйны калектыў. Выказваем падзяку рэдакцыйнай калегіі, а таксама рэцэнзентам за грунтоўнае і крытычнае стаўленне да адбору артыкулаў. Дзякуем карэктарам і перакладчыкам за іх адказны падыход да тэкстаў. За аператыўную і тэхнічную працу мы ўдзячныя вярстальшчыку. І, канешне, дзякуем аўтарам за давер і супрацу з рэдакцыяй.

**Таццяна Касатая**